44. Ocupaţia sovietică în România: Documente, 1944–1946. – Bucureşti : Vremea, 1998. – 237 p.
45. Od rozpadu Česko-Slovenska do uznání československé prozatímní vlády 1939–1940. – Praha : ÚMV, 2002. – 731 s.
46. Od uznání československé prozatímní vlády do vyhlášení válečného stavu Německu 1940–1941: u 2 sv. – Praha : ÚMV, 2006–2009. – Sv. 1. – 422 s.; – Sv. 2. – 544 s.
47. Polish documents on foreign policy: 24 October 1938 – 30 September 1939. – Warsaw : The Polish Institute of International Affairs, 2009. – 446 s.
48. Polskie dokumenty dyplomatyczne 1939 : Styczeń-Sierpień. – Warszawa : Polski Instytut Spraw Międzynarodowych, 2005. – 896 s.
49. «Powstanie» na Zaolziu w 1938 r. Polska akcja specjalna w świetle dokumentów Oddziału II Sztabu Głównego WP. – Warszawa : Adiutor, 1997. – 191 s.
50. Răzvan, Limona. Naţionalităţile şi problemele lor în documentele de arhivă dobrogene (1879–1941) / L. Răzvan. – Tulcea : Editura Harvia, 2007. – 140 p.
51. România şi Ungaria în faţa Conferinţei de Pace de la Paris (1945–1947). – Târgu Mureş : Editura Universităţii «Petru Maior», 2010. – 295 p.
52. Slovensko-nemecké vzťahy 1938–1941 v dokumentoch: v 2 sv. – Bratislava : Universum, 2009–2011. – Sv. I. – 1171 s.; – Sv. II. – 1093 s.
53. Soviet Occupation of Romania, Hungary and Austria, 1944/45–1948/49. [Documentary collection]. – Budapest ; New York : Central European University Press, 2015. – 380 p.
54. Szekfű Gyula követ és moszkvai magyar követség jelentései (1946–1948). – Budapest : Magyar Országos Levéltár, 1998. – 210 old.
55. «Tretia ríša» a vznik Slovenského štátu: u 3 sv. – Bratislava : Ústav pamäti národa, 2008–2011. – Dokumenti I. – 627 s.; – Dokumenty II. – 556 s.
56. Viedenská arbitráž – 2. november 1938: u 3 sv. – Martin : Matica Slovenská, 2002–2005. – Dokumenty I. – 256 s.; – Dokumenty II. – 304 s.; Dokumenty III. – 456 s.
57. Jugoslavija 1918.–1988.: tematska zbirka dokumenata. – Beograd : Rad, 1988. – 1445 s.

**Сівохін Г.А., Сямашка К.У.**

## ДА ПЫТАННЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА АРХІЎНЫХ УСТАНОЎ І МУЗЕЯЎ У НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ І ЭКСПАЗІЦЫЙНА-ВЫСТАВАЧНАЙ РАБОЦЕ. З ДОСВЕДУ ВЫКАРЫСТАННЯ АРХІЎНЫХ КРЫНІЦ У ДЗЕЙНАСЦІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАГА МУЗЕЯ-ЗАПАВЕДНІКА "ЗАСЛАЎЕ"

Аснова пабудовы музейнай экспазіцыі – гэта музейны прадмет. Аксіёма, якая не выклікае пярэчанняў. Аднак артэфакты, уключаныя ў музейны фонд пэўнага музея, не заўжды могуць у поўнай меры раскрыць заяўленую экспазіцыйную тэму. У такіх выпадках на дапамогу могуць прыйсці, напрыклад, зборы іншых музеяў і прыватныя калекцыі. Але не менш, а часта і значна больш важную, чым азначаныя вышэй разам узятыя музейныя і прыватныя зборы, ролю ў раскрыцці заяўленай у часовым экспазіцыйна-выставачным праекце альбо ў пастаяннай экспазіцыі тэмы граюць архіўныя фонды. Менавіта яны дапамагаюць раскрыць дакументальным і фоташэрагам пакладзены ў праект *сэнс*, напоўніць бязлікія прадметы персанальнай жывой і актуальнай – часта бадай *інтымнай*, – інфармацыяй.

Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" (далей – Запаведнік) мае багаты досвед выкарыстання архіўных крыніц у сваёй рабоце. Сярод апошніх такіх праектаў, рэалізаваных цягам 2022, варта адзначыць мемарыяльны экспазіцыйна-выставачны праект "Аўта/Партрэт Рэканструктара" [7] і фотадакументальны праект "Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст." [6].

Так, з 25 жніўня па 6 лістапада 2022 ў Запаведніку праходзіў мемарыяльны экспазіцыйна-выставачны праект "Аўта/Партрэт Рэканструктара". Праект быў рэалізаваны Запаведнікам сумесна з Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва ў рамках серыі навукова-даследчых экспазіцыйна-выставачных праектаў "Этнаграфіка рэчавіду" і быў прымеркаваны да 85-ых угодак з нараджэння і 20-ых – са дня смерці мастака і культурнага дзеяча Яўгена Куліка.

Яўген Кулік (31 кастрычніка 1937 – 12 студзеня 2002) – беларускі графік, які належаў да генерацыі дзяцей вайны. Гэта тыя самыя паваенныя маладзёны, якія стваралі сённяшнюю Беларусь – *Беларусь мастацкую*, *Беларусь культурніцкую*, *Беларусь гістарычную*, *этнаграфічную* дый *даследчую*. У чымсьці, вядома, яны працягвалі справу і спадкавалі папярэднікам – і беларусам міжваення, і беларусам канца XIX – пачатку XX стагоддзя. А ў чымсьці яны былі і абсалютна арыгінальнымі і непаўторнымі, у чымсьці яны былі піянерамі… Гэта менавіта яны, юнакі ды дзяўчаты, чыё сталенства прыйшлося на паваенныя гады, абралі лірыку лейтматывам свайго жыцця дый на тэй лірыцы ўзрасцілі плённае жніво беларушчыны. І майстэрня Яўгена Куліка – ягоны *Паддашак* [5], – і была аднэй з тых шматлікіх пожняў, на якой калісь і забуяла сучасная беларуская культура.

У выставачным праекце была зробленая спроба прадэманстраваць творчасць Яўгена Куліка праз антрапалагічны позірк – прэзентаваць не толькі ягоную мастацкую, але і культурніцкую і даследчую дзейнасць, паспрабаваць антрапалагічна асэнсаваць, г.зн. *апісаць як этнограф у полі*, яго *арт*-работу гістарычнага рэканструктара… Рэканструктарскі аспект работ Яўгена Куліка лучыць у сабе і творчасць, і навуковы вышук. Разам з гісторыкамі, археолагамі, этнографамі мастак спрабаваў весці глыбінныя доследы беларускай мінуўшчыны і аднаўляць – рэканструяваць і ствараць вобразы, – беларускія гарады, даўнія храмы, камяніцы з фартэцыямі… Дый саміх "даўніх" беларусаў мастак таксама далікатна "адраджаў", ствараючы на паперы іх вобразы-відарысы. Таксама Яўген

Кулік фіксаваў тое, што яшчэ не было страчанае, але магло быць зруйнаваным. Нават тыя напаміны даўніны, якім быццам не пагражала пляжанне, мастак усё адно *фіксаваў*. Фіксаваў па-мастацку, дадаючы кожнаму аб'екту пэўнай вобразнасці, падбіраючы да кожнай страхі храму ці замку сваю хмарку-аблачынку, быццам архітэктар-рэстаўратар.

З шаснаццаці графічных лістоў, што захоўваюцца ў зборы Запаведніка, пяць – рэканструкцыі адзення XII стагоддзя, а адзінаццаць – гэта архітэктурныя вобразы: касцёл у Гнезне і абарончыя цэрквы ў Мураванцы і Сынкавічах, XVI ст., а таксама Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне з Кальвінскім зборам у Смаргоні таго ж XVI ст. Тут і кляштар бернардзінцаў у Гродне, XVI–XVIII стст., і ансамбль Жыровіцкага манастыра, XVII–XIX стст. Храмавыя выявы дапоўненыя шэрагам выяў замкаў і палацаў: палац Валовічаў у Свяцку, XVIII ст., замак у Міры, XVI–XVII стст., замак з фарным касцёлам у Навагрудку, XIII–XVIII стст. І, вядома ж, рэканструкцыя заслаўскага гарадзішча "Замэчак", X–XI стст.

У зборы Запаведніка захоўваюцца сапраўдныя рарытэты. І гэта не толькі тыя шаснаццаць выяў рукі Яўгена Куліка, якія былі прэзентаваныя на выставе. Хапае ў фондах Запаведніка і археалагічных знаходак з заслаўскіх раскопак. Гэта сапраўдныя археалагічныя артэфакты – менавіта яны натхнялі Я. Куліка як мастака-рэканструктара, калі той ствараў пэўныя свае творы: тут жа ў выставачнай зале можна было параўнаць арыгінальныя наканечнікі дзідаў ці скроневыя колцы з іх выявамі на гістарычных рэканструкцыях мастака. У сваіх рэканструкцыях вобразы даўніх *продкаў беларусаў* і *даўняй* Беларусі Я. Кулік ствараў, працуючы, да прыкладу, разам з гісторыкам Міколам Ермаловічам або выбітным археолагам Міхасём Ткачовым.

У праекце можна было пабачыць археалагічныя артэфакты і сапраўдныя – арыгінальныя, – архіўныя дакументы. Артэфакты з раскопак старажытнага Заслаўя, якія цяпер захоўваюцца ў музейным зборы. А таксама дакументы, якія калісь належалі альбо былі створаныя самім мастаком, а цяпер захоўваюцца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музее літаратуры і мастацтва: малюнкі, фатаграфіі аб'ектаў драўлянага сакральна-манументальнага дойлідства Беларусі, віншавальныя паштоўкі, перапіска і інш. [1].

На выставачным праекце апрача графічных работ Яўгена Куліка былі прадстаўленыя не толькі здабыткі археалогіі, але і сучасныя, аднак не менш каштоўныя артэфакты – у рамках экраннай экспазіцыі былі прадстаўленыя лічбавыя вобразы архіўных дакументаў з фонду Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва – палявыя запісы і працоўныя матэрыяламі мастака-рэканструктара. Кодай праекта стала зона – экранная экспазіцыя, дзе ў відэаінсталяцыі можна было пабачыць шэраг невялічкіх фрагментаў з інтэрв'ю, узятых у сваякоў, калег і паплечнікаў Яўгена Куліка, у даследчыкаў беларускай даўніны дый стваральнікаў беларускага мастацтва – у тых, хто асабіста ведалі Яўгена Куліка, а сваім лёсам былі павязаныя з Заслаўем:

– *Вольга Дрыбіна* – пляменніца Яўгена Куліка;

– *Мікалай Паграноўскі* – знаны беларускі мастацкі крытык, арт-тэарэтык, старшыня секцыі мастацтвазнаўства Беларускага саюза Мастакоў, лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне", у 2005–2015 гг. – дырэктар Запаведніка;

– *Юры Піскун* – Мастак, Творца, Настаўнік, паплечнік і калега героя праекта, аўтар габелена "Полацкія званы" і разам з Вольгай Дзёмкінай – габелена "Малітва", на якіх грунтуецца гістарычная экспазіцыя па гісторыі Заслаўя, прэзентаваная ў габеленавай зале музейнай-выставачнага комплексу Запаведніка.

– *Алег Трусаў* – кандыдат гістарычных навук, вядомы археолаг і знаны папулізатар беларускай даўніны, дацэнт Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў, даследчык гісторыі беларускай архітэктуры, кіраўнік археалагічных даследаванняў гарадзішча "Вал" у Заслаўі.

Да выставы куратарамі быў дадаткова распрацаваны мультымедыя-гід на базе сервіса izi.TRAVEL [2].

Медыя-гід прадстаўляе з сябе пяць калекцый, у якіх тэматычна змешчаныя прадметы з выставы, а таксама лічбавыя копіі асабістых дакументаў Я. Куліка, прадстаўленыя Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва. Да кожнай калекцыі і кожнага прадмета падрыхтаваныя і размешчаныя дадатковыя тэксты, створаныя на аснове публікацый Ю.А. Зайца з манаграфіі "Заславль в эпоху феодализма" і энцыклапедычнага выдання "Архітэктура Беларусі". Куратарамі праведзеная фотафіксацыя прадметаў археалогіі з музейнага збору для размяшчэння выяў у медыя-гідзе.

Так, напрыклад калекцыя "Рэканструкцыя Яўгена Куліка" складаецца з лічбавай копіі "Прапановы па развіццю музеяў у Беларускай ССР", распрацаваныя Яўгенам Куліком, Міхалам Дубянецкім, Міколам Купавам і іншымі, прадстаўленай установай "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва".

Іншы сумесны музейна-архіўны праект – фотадакументальны праект Запаведніка і Дзяржархіва Мінскай вобласці “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.”, – экспанаваўся ў музейна-выставачным комплексе Запаведніка з 21 кастрычніка 2022 па 15 студзеня 2023. Яго экспазіцыя ілюструе невялічкі перыяд з тысячагадовай гісторыі Заслаўя – усяго толькі 38 год існавання Заслаўскага раёна. Амаль што чатыры дзесяцігоддзі, кавалак часу пачынаючы з 1920-ых па канец 1950-ых, з жыцця мястэчка на выставе прадстаўленыя фотавыявамі і архіўнымі дакументамі.

Так, экспазіцыйны праект асвяціў асобныя старонкі жыцця г. Заслаўя ў розныя часы існавання СССР. Перад усім акцэнт быў зроблены на гісторыі Заслаўскай воласці і Заслаўскага раёна ў савецкі перыяд (да 1959 уключна). Каб паўнавартасна асвяціць гэты час у музейнай экспазіцыі куратары выставы звярнуліся па дапамагу ў галоўную архіўную ўстанову Мінскай вобласці. Былі перагледжаны некаторыя архіўныя справы, адабраныя па азначаным перыядзе, і сярод шматлікіх архіўных дакументаў выбраны найбольш неабходныя матэрыялы для экспанавання. Супрацоўніцтва з Мінскім абласным архівам дало магчымасць наведвальнікам Запаведніка пазнаёміцца з гісторыяй Заслаўскага раёна не толькі праз музейныя прадметы і вобразы, зафіксаваныя на фотаздымках, але і праз архіўныя дакументы – найкаштоўныя гістарычныя крыніцы. На выставе былі прадстаўлены дакументы Заслаўскага РК КПБ. Сярод дакументаў фонду 185-П “Заславский районный комитет Коммунистической партии (большевиков) Белоруссии, м. (с 27.09.1938 – г.п.) Заславль Заславского района Минского округа, с 26.07.1930 – Заславского района, с 20.02.1938 – Заславского района Минской области” прадстаўленыя наступныя справы: спр. 6 “Протокол заседания I съезда Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов Заславского района от 07.12.1924 г.”; спр. 10 “Протоколы заседаний Заславской волостной ячейки КП(б)Б план работы района КП(б)Б, сведения о социально-экономическом положении района и о работе сельскохозяйственных и молочных товариществ, отчет о работе бюро ячеек КП(б)Б 15-го пограничного отряда”; спр. 50 “Циркуляр ЦК КП(б)Б от 30.04.1926 «Методы антисионистской агитации и пропаганды”, протоколы заседаний Еврейского бюро Минского окружкома КП(б)Б, списки граждан еврейской национальности Заславского района по состоянию на 07.04.1927 г.”; спр. 105 “Переписка с управлением 15-го Заславского пограничного отряда о социально-экономическом и политическом положении Заславского района”; спр. 167 “Постановления и выписки из протоколов заседаний Заславского райкома и бюро райкома КП(б)Б, переписка с ЦК КП(б)Б, Засласвским райотделом НКВД БССР и управлением 15-го Заславского пограничного отряда о грубых нарушениях советского законодательства в учреждениях и колхозах района и о выселении неблагонадежных граждан из пограничной зоны” [3].

Асаблівую цікавасць выклікалі дакументы акупацыйнага перыяду з фонду 1039 “Коллекция малообъемных фондов учреждений оккупационного периода 1941–1944 гг.” [3]. У адной падшыўцы былі згрупіраваныя дакументы “Заславская районная управа. Списки работников районной и волостной управ, предприятий и учреждений района за 1942 г.”, у іншай – “Заславская районная управа. Заявления граждан об оказании помощи в приобретении и постройке жилых домов, акты осмотра и оценки строений, справки о составе семьи”. Склад дакументаў фонду разнастайны – гэта загады, інструкцыі, распараджэнні, пратаколы, справаздачы, штатныя расклады, перапіска, рапарты і данясенні, заявы, ведамасці, спіскі, анкеты, журналы ўліку і інш.

Такім чынам, сумесны выставачны праект уяўляў з сябе align рознабаковае даследаванне-аповед пра гісторыю Заслаўя і Заслаўскага раёна за перыяд з 1920-х па 1959-ы. Такая супраца Запаведніка з архіўнымі ўстановамі яшчэ раз – і ўжо не ўпершыню, – пацвердзіла выдатны вынік сумесных намаганняў у вяртанні да мінулага і практык аповеду пра яго.


1. Выстава “Аўта/Партрэт Рэканструктара” [Электронны рэсурс] / Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Рэжым доступу: http://bdamlm.by/news/vystava-autapartret-rekanstruktara. – Дата доступу: 05.09.2022.
2. Мультымедыя-гід па экспазіцыйна-выставачным праекце “Аўта/Партрэт Рэканструктара” [Электронны рэсурс] / Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». – Рэжым доступу: http://zaslaue.museum.by/be/node/63810. – Дата доступу: 02.09.2022.
3. Сямашка, К. Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст. Пасляслоўе [Электронны рэсурс] / К. Сямашка // Заслаўскія зборы. – 2023. – № 33. – С. 14–20. – Рэжым доступу: http://zaslaue.museum.by/files/zaslauskiya_zbory_no33_studzen_2023_g_0.pdf. – Дата доступу: 31.01.2023.
4. Сямашка, К. “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.”. Разглядаем дэталі… [Электронны рэсурс] / К. Сямашка // Заслаўскія зборы. – 2022. – № 31. – С. 1–4. – Рэжым доступу: http://zaslaue.museum.by/files/31_listapad_2022_zaslauskiya_zbory.pdf. – Дата доступу: 31.11.2022.
5. Тарас, А. Яўген Кулік: рыцар сваёй Айчыны / А. Тарас. – Рыга : Інстытут беларускай гісторыі і культуры, 2018. – 63 с.
6. Фотадакументальны праект “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.” [Электронны рэсурс] / Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». – Рэжым доступу: http://zaslaue.museum.by/be/node/64709. – Дата доступу: 21.10.2022.
7. Экспазіцыйна-выставачны праект “Аўта/Партрэт Рэканструктара” [Электронны рэсурс] / Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе». – Рэжым доступу: http://zaslaue.museum.by/be/node/63576. – Дата доступу: 25.08.2022.